View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



ках рэгіёну: *ка́ска, зага́тка, но́шка, ба́пка, сус'е́тка*.

5. Аглушэнне звонкіх зычных на канцы слоў: *дуп, сат, плух, лух, стох*.
6. Наяўнасць прыстаўных [г] ці [в]: *во́з'еро, во́с'ен', во́страў, го́стры, гастры́ц', абго́рвац' (во́з'аро, во́с'ан', во́стры, вастры́ц', вбво́рвац')*.

Разгледжаныя асаблівасці фанетычнай сістэмы гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны сведчаць, што гаворкі жыхароў гэтай мясцовасці знаходзяцца ў зоне міждыялектных кантактаў: тут праходзіць мяжа паміж заходнепалескай і гродзенска-баранавіцкай групамі гаворак.

ЛІТАРАТУРА


1. *Босак, А.А.* Атлас гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над'ясельдзя): у 2 ч. / А.А. Босак, В.М. Босак. – Мінск: УП «ІВЦ Мінфіна», 2005–2006. – 2 ч.
2. *Вайтовіч, Н.Т.* Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі / Н.Т. Вайтовіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1968. – 219 с.
3. *Вэкслер, П.* Гістарычная фаналогія беларускай мовы / П. Вэкслер; пер. з англ. А. Літвіноўскай, М. Раманоўскага; навук. рэд. пер. Г. Цыхун. – Мінск: Логвінаў, 2004. – 254 с.
4. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы [карты]. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1963. – VIII + 338 карт.
5. *Леванцэвіч, Л.В.* Атлас гаворак Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці: у 3 ч. / Л.В. Леванцэвіч. – Брэст: Брэст. дзярж. ун-т., 1993–2001. – 3 ч.
6. Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак / пад рэд. Р.І. Аванесава, К.К. Атраховіча (Крапівы), Ю.Ф. Мацкевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 80 карт.
7. Нарысы па беларускай дыялекталогіі: вуч. дап. для філал. фак. ун-таў і пед. ін-таў / Р.І. Аванесаў [і інш.]; пад рэд. Р.І. Аванесава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1964. – 415 с.


SUMMARY

*The chief purpose of the article is to consider the phonetic dialect system of the north-western Brest region on a basis of wide factual material.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*УДК 81'367*

***Н.У. Чайка***

## З'ЯВА СІНТАКСІЧНАЙ НЕПАЎНАТЫ Ў СТРУКТУРНЫМ АСПЕКЦЕ

Праблема эліпсіса з'яўляецца надзвычай актуальнай. У гісторыі мовазнаўства розныя школы і напрамкі вывучалі названую з'яву. Але найбольш поўна распрацоўвалася праблема няпоўных рэалізацый сінтаксічных канструкцый у працах прадстаўнікоў структурнага сінтаксісу. Як лінгвістычны напрамак структурны сінтаксіс сфарміраваўся ў 20–30-я гады XX стагоддзя. Узнікненне структурнага сінтаксісу дыктавалася неабходнасцю пошукаў больш паслядоўнай сістэмы для апісання і ўпарадкавання моўных з'яў у параўнанні з папярэднімі школамі. Структурны сінтаксіс выпрацаваў сваю тэарэтычную базу і метадалагічны апарат. Асноўнымі метадалагічнымі прынцыпамі пры аналізе моўных з'яў былі паўната, сістэмнасць, іманентнасць. Асноўнымі аб'ектамі даследавання былі структура плана выражэння (як найбольш даступная для сістэмнага апісання), адносіны паміж элементамі моўнай сістэмы, семантыка сінтаксічнай адзінкі. Разнастайныя метады даследавання, выпрацаваныя структуралістамі (метад кампанентнага аналізу, дыстрыбутыўны метад, канструктыўны метад і іншыя), далі магчымасць даследаваць сістэму сінтаксісу і вылучыць абагуленыя інварыянтныя адзінкі – схемы і мадэлі сказаў, суаднесці іх з канкрэтнымі моўнымі рэалізацыямі на аснове пэўных правіл. Гэтыя правілы і вызначаюць межы дапушчальных варыятыўных змен сінтаксічнай адзінкі пры ўмове захавання семантычнай саматоеснасці. Такім чынам, з развіццём структуралізму сінтаксічная навука паднялася на якасна новую ступень свайго развіцця і адкрыліся перспектывы для даследавання найбольш складаных і нявырашаных праблем мовазнаўства.

Што датычыцца праблемы няпоўных рэалізацый сінтаксічных мадэлей, то перспектывы для яе ўсебаковага аналізу адкрыліся яшчэ на першым этапе развіцця структуралізму (20-я гады XX стагоддзя) пасля выхаду першых прац Фердэнанда дэ Сасюра. Пасля размежавання Сасюрам мовы і маўлення стала магчымым кваліфікаваць канструкцыі з сінтаксічным нулём і эліпсісам як рэалізацыі няпоўных мадэлей у маўленні. Разам з тым стала магчымым даследаваць семантыку названых сінтаксічных канструкцый у плане тоеснасці / нятоеснасці мадыфікацыі і мадэлі і функцыянальную маркіроўку разглядаемых канструкцый. Акрамя таго, прынцып іманентнасці, сфармуляваны Фердэнандам дэ Сасюрам, прадвызначае строгае адмежаванне аб'екта даследавання лінгвістыкі ад сумежных аб'ектаў іншых навук. Такім чынам былі выключаны нелінгвістычныя даследаванні моўных з'яў папярэднімі школамі – змяшэнне лагіцыстамі катэгорый сінтаксісу з катэгорыямі ло-

гікі і замена сінтаксічных кампанентаў кампанентамі лагічнага суджэння. Таму ўпершыню ўдалося пазбегнуць неапраўдана пашыранага (лагіцысты) і неапраўдана звужанага (псіхалагісты) разумення няпоўнасастаўных рэалізацый сінтаксічных канструкцый.

Рэвалюцыйнай з’явілася распрацоўка Люсьенам Тэньерам асноўных палажэнняў структурнага сінтаксісу. Наватарства Тэньера заключаецца ў адмежаванні катэгарыяльнага (статычнага) і структурнага (дынамічнага) сінтаксісу. Вучоны вылучыў некалькі відаў кампанентаў семантычнай структуры сказа: вузлавы кампанент (іерархічна галоўны) і актанты з сірканстантамі. Дзякуючы гэтаму, з’явілася магчымасць адмежаваць сказы з сінтаксічным нулём і эліпсісам ад знешне падобных сінтаксічных з’яў.

Нельга не закрануць пытанні пра адваротную валентнасць другіх актантаў (А 2), распрацаваную вучонымі. Гэта таксама адыграла вялікую ролю ў распрацоўцы праблемы няпоўнасастаўных сінтаксічных мадыфікацый. Як бачна, асноўныя палажэнні Люсьена Тэньера адыгралі вялікую ролю ў фарміраванні тэарэтычнай базы структурнага сінтаксісу. Праца адкрыла перспектывы для вывучэння найбольш значных сінтаксічных праблем, у тым ліку і пытання пра няпоўнасастаўныя рэалізацыі сінтаксічных мадэлей. Далейшая распрацоўка праблемы канструкцый з сінтаксічным нулём і эліпсам вырашалася ў рамках пэўнай канцэпцыі ў адпаведнасці з пэўнымі тэарэтычнымі і метадалагічнымі прынцыпамі.

Існуюць меркаванні, што «незамяшчальнасць сінтаксічнай пазіцыі дзеяслоўнага выказніка носіць сінкрэтычны характар. З боку лексічнага значэння яна з’яўляецца фактам мовы і абумоўлена мадэллю сказа і яго сінанімічнай парадыгмай, і таму можа разглядацца як нулявы паўназначны дзеяслоў (нулявая лексема). З боку ж граматычнага значэння (прэдыкатыўнасці) яна з’яўляецца фактам маўлення і таму павінна быць кваліфікавана як сінтаксічная непаўната (эліпсіс)» [3, с. 39].

Адносна структуры няпоўнасастаўных канструкцый выказваліся самыя розныя, часам супярэчлівыя думкі. Большасць даследчыкаў (Э.П. Вардуль, Л.С. Бархудароў і інш.) лічаць эліптычныя сказы няпоўнымі.

Распрацоўка І.Ф. Вардулем пытання пра інварыянтныя сінтаксічныя мадэлі дазволіла дакладна вызначыць структуру эліптычнага сказа: «Эліпсіс не мяняе ні змест, ні структуру сказа. Ён адлюстроўваецца толькі ў плане выражэння. Таму можна зрабіць выснову, што эліптычны варыянт узыходзіць да поўнага інварыянта» [4, с. 64]. Падобнай думкі прытрымліваецца і Г. Інфантава. «У сістэме мовы эліптычныя сказы не ўяўляюць сабой інварыянтаў, яны існуюць на фоне дзеяслоўных сказаў, як бы спраецыраваны на іх, што дазваляе эліптычным сказам выражаць пэўную дзеяслоўную семантыку (лексічную і граматычную). У сувязі з гэтым стабільнасць саставу эліптычных сказаў (наяўнасць мінімальных структурных схем) можна разглядаць як іх прыналежнасць да мадэлей другога парадку, у аснове якіх ляжаць адпаведныя дзеяслоўныя інварыянты» [5, с. 24]. У кожнай мове ёсць свае сінтаксічныя схемы і мадэлі, правілы іх утварэння, якія неабходна ўлічваць пры аналізе моўных з’яў. Заўсёды трэба зыходзіць з таго, што «сказ уяўляе сабой пазіцыйную структуру іерархічна ўпарадкаваных пазіцый, здольных замяшчацца некаторым наборам словаформ» [5, с. 13]. І калі адна з гэтых словаформ адсутнічае, то правамерна кваліфікаваць як эліптычны сказ.

Падобнага пункту погляду на праблему прытрымліваецца А. Скавароднікаў, аднак даследчык разглядае аднасастаўныя і эліптычныя сказы як з’явы аднаго парадку – эліпсіс моўны і эліпсіс маўленчы. Думаецца, не варта было б падмяняць паняцце пропуску члена сказа паняццем колькасці саставу сказа. Аднасастаўнасць/двухсастаўнасць сказа звязана са спосабамі выражэння прэдыкатыўнасці ў сказе і не мае дачынення да пропуску структурна неабходных кампанентаў няпоўных сказаў. Лічым, што аднасастаўнасць і эліпсіс – розныя сінтаксічныя з’явы.

Тэорыя інварыянтных сінтаксічных мадэлей дазволіла не толькі кваліфікаваць эліптычны сказ як няпоўны двухсастаўны з пропускам дзеяслова, але і размежаваць сумежныя ці знешне падобныя з’явы, вызначыць тып эліпсіса.

Аднак некаторыя даследчыкі лічаць эліптычныя сказы і сказы з сінтаксічным нулём абсалютна поўнымі і дастатковымі для перадачы неабходнай інфармацыі (Г.А. Золатава, П.А. Лекант). Аргументы гэтых даследчыкаў наступныя: іменныя словаформы ў эліптычных сказах з’яўляюцца свабоднымі, не залежаць ад дзеяслова, а самі сказы маюць дастаткова сродкаў для перадачы працэсуальнасці. Нельга не пагадзіцца з тым, што эліптычныя сказы з’яўляюцца функцыянальна дастатковымі: у пэўным кантэксце яны перадаюць пэўную інфармацыю і выконваюць камунікатыўную функцыю. Аднак ці дае гэта падставы лічыць іх структурна поўнымі? У эліптычных канструкцыях і сказах з сінтаксічным нулём заўсёды ёсць сірканстанты ці дэтэрмінаваныя акалічнасці, якія маюць выключна аддзеяслоўную залежнасць. Думаецца, сцвярджаць, што эліптычныя канструкцыі і ска-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зы з сінтаксічным нулём з'яўляюцца структурна поўнымі, было б няправільным.

Такім чынам, тэорыя інварыянтных сінтаксічных мадэлей дазволіла не толькі глыбока прааналізаваць структуру няпоўных рэалізацый сінтаксічных канструкцый, але і суаднесці кожную канкрэтную рэалізацыю з адпаведнай сінтаксічнай мадэллю. Былі распрацаваны віды эліпсіса – кантэкстуальны, сітуацыйны і ўнутрысінтагматычны. Канструкцыі з сінтаксічным нулём былі падзелены на сказы з пропускам дзеяслова-звязкі, быційныя сказы з пропускам дзеяслова *быць* у пэўнай часава-мадальнай форме. Відавочна, што тэорыя сінтагматыкі і парадыгматыкі, інварыянтных сінтаксічных мадэлей дазволіла ў поўнай ступені размежаваць з'явы з сінтаксічнай непаўнатой і кваліфікаваць іх у адпаведнасці з пэўным інварыянтам у сістэме мовы.

Вырашыўшы праблему інварыянтаў сінтаксічных мадэлей, вучоныя паставілі новую задачу – даследаваць мадэль сказа і тыпы яе рэалізацыі ў тэксце, якія дазваляюць уявіць усё мноства няпоўных рэалізацый сінтаксічных адзінак у выглядзе канечнага мноства аднаўзроўневых адзінак сінтаксічнай сістэмы. Праблему мадэліравання распрацоўвалі І.Ф. Вардуль, Г.А. Золатава і іншыя.

Тэорыя мадэліравання сказаў стала адной з цэнтральных праблем сінтаксісу, у рамках якой неабходна было вырашыць такія пытанні, як крытэрыі выдзялення структурнага мінімуму няпоўных канструкцый, методыка запісу мадэлей, магчымасць варыянтнасці ў рамках трэснасці мадэлі. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе разглядаць сказы з эліпсісам і сінтаксічным нулём як рэгулярныя рэалізацыі мадэлей (Г.А. Золатава).

Праблема канструкцый з сінтаксічным нулём цесна звязана з праблемай дэтэрмінаваных членаў сказа. Пытанне пра дэтэрмінаваныя члены сказа распрацоўвалі Г.А. Золатава, В. Блох і іншыя даследчыкі. Дэтэрмінуючыя члены сказа характэрны для вялікай колькасці сінтаксічных канструкцый і ў некаторых з іх з'яўляюцца абавязковымі кампанентамі сінтаксічнай структуры. Да такіх канструкцый адносяцца быційныя сказы з прапушчаным дзеясловам-звязкай *За вёскай – прыгожае возера*, сказы са значэннем валодання *У хлопчыка – прыгожы голас*, сказы з колькасна-іменным спалучэннем *У калгасе – восемдзесят два новыя катэджы*, сказ са значэннем псіхічнага ці фізічнага стану, у якіх могуць адбыцца пэўныя трансфармацыі *У чалавека – шчаслівы выгляд; Мікола – у салдатах*. Наяўнасць сінтаксічнага нулявання ў такіх сказах даказваецца тым, што ў тэмпаральнай парадыгме нулявая звязка праяўляецца ў форме прошлага і будучага часу.

Вучэнне пра дэтэрмінаваныя члены сказа ўнесла вялікі ўклад у распрацоўку праблемы канструкцый з сінтаксічным нулём. Вылучэнне дэтэрмінаваных акалічнасцей у сказах з сінтаксічным нулём дало магчымасць вызначыць умовы сінтаксічнага нулявання, семантычныя разнавіднасці нулявога кампанента, таксама некаторыя дапушчальныя трансфармацыі сказаў з сінтаксічным нулём.

Прааналізаваўшы даследаванні прыхільнікаў структурнага сінтаксісу, нельга не звярнуць увагу на тое вялікае значэнне, якое мелі яны ў вырашэнні праблемы няпоўнасастаўных канструкцый. Пры ўсёй стракатасці, часам супярэчлівасці канцэпцый, вучоным усё ж удалося вызначыць найбольш тыповыя рысы канструкцый з сінтаксічным нулём і эліпсісам, глыбока раскрыць сутнасць названых з'яў у структурным плане. Структурныя метады даследавання (метад непасрэдна складаючых, дыстрыбутыўны метад, метад кампанентнага аналізу, трансфармацыйны) дазволілі ўстанавіць наяўнасць іерархіі сувязей паміж элементамі сказа і падыйсці да пабудовы структурных мадэлей сказа. Гэта, у сваю чаргу, дало магчымасць дакладна кваліфікаваць няпоўнасастаўную канструкцыю, у якой прапушчаны структурна неабходны кампанент. Тэарэтычная распрацоўка пытанняў сінтагматыкі і парадыгматыкі сказа дала магчымасць размежаваць такія з'явы, як сінтаксічны нуль (як парадыгматычную з'яву) і эліпсіс (як сінтагматычную з'яву). Падыход да пералічаных з'яў набыў дыферэнцыраваны характар, што дазволіла размежаваць і ўпарадкаваць многія знешне падобныя з'явы.

Развіццё тэарэтычнай базы і ўдасканальванне метадалагічнага апарату сінтаксісу паставіла перад навукай новыя задачы. Перш за ўсё гэта праблема семантычнай арганізацыі сінтаксічных канструкцый (у тым ліку і няпоўнасастаўных). Патрабавала вырашэння і праблема некаторых сінтаксічных трансфармацый тыпу *Дзяўчына – у плач*, у слёзы (К. Чорны); *А мне – ні радасці, ні сну* (Р. Баравікова); *Душа – у агні? Свабода – на каленях*?.. (Т. Бондар). Неабходна было ўстанавіць, да якой канструкцыі ўзыходзіць кожны трансформ, вызначыць правілы трансфармацыі і дакладна кваліфікаваць дадзеныя канструкцыі. Для вырашэння пастаўленай задачы неабходна было распрацаваць якасна новую тэарэтычную базу і метады даследавання. Такой базай з'явілася семантычная сінтаксічная школа.

*ЛІТАРАТУРА*

1. *Бархударов, Л.С.* Семантические типы пояснительных конструкций / Л.С. Бархударов // Семантические типы пояснительных конструкций: межвуз. сб. науч. тр. /

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

О.П. Гришковская; под ред. П.А. Леканта. – М.,1991. – С. 79–84.
2. *Балли, Ш.* Семантизация эллиптических конструкций как условие существования в диалоге / Ш. Балли; отв. ред. Л.И. Баранникова. – Саратов, 1988. – 84 с.
3. *Блох, М.Я.* Информативная неоднородность неполносоставных высказываний / М.Я. Блох // Семантика слова и синтаксической конструкции: межвуз. сб. науч. тр. / В.В. Кузьмина; под ред. З.Д. Поповой. – Воронеж,1987. – С. 153–161.
4. *Вардуль, И.Ф.* Основы структурного синтаксиса / И.Ф. Вардуль. – М.: Прогресс, 1988. – 256 с.
5. *Золотова, Г.А.* Безобъектное употребление переходных глаголов в эллиптических конструкциях / Г.А. Золотова // Лингвистические исследования: сб. ст. / Г.А. Золотова; под ред. Н.А. Андреева. – М., 1985. – 240 с.

*SUMMARY*

*The article is dedicated to one of the urgent problems, that is to the problem of the semantic organization of constructions with the ellipsis of the verb. The semantic organization of constructions with the ellipsis of the verb is considered in the article: the quantitative and qualitative composition of components of the semantic structure. The kinds of octants ($A_1$, $A_2$, $A_3$) and their functional realizations, i.e. the subject, the object, the agent, the agnetive, the functive and others, are analysed in detail.*

*The secondary predication of elliptic constructions and the ways of expressing the predication, i.e. octants and circumstants, are researched in the article.*

*The article also includes the analysis of the grammatical and semantic structure of elliptic constructions. The grammatical specification cannot be expressed by predicative means by reason of the absence of the verb. The named meaning can be expressed with the help of particles and syntactic parallelism.*

*Consideration is also given to the semantic specification of elliptic constructions which is realized with the help of polylevel units, i.e. intrasyntagmatic, syntactic, supersyntactic.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ